# Давыд Гарадзенскі вярнуўся ў Гродна

Помнік адной са знакавых гістарычных фігур краіны быў у чацвер устаноўлены на скрыжаванні гродзенскіх вуліц Замкавай і Давыда Гарадзенскага побач са Старым і Новым замкамі. Вышыня помніка з пастаментам — каля 4 метраў. Яго ўстаноўку прымеркавалі да XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў горадзе над Нёманам 1—2 чэрвеня. Менавіта ў першы дзень фестывалю запланавана ўрачыстае адкрыццё помніка: тут з удзелам сярэднявечных рыцараў чакаецца тэатралізаваны паказ.

Вырабіў помнік з суцэльнага кавалка граніту сталічны скульптар Сяргей Аганаў. Ён стаў пераможцам конкурсу эскізных праектаў, які праводзіўся ў пачатку 2017 года. Заказчык — Гродзенская дыяцэзія БПЦ, усе выдаткі ўзяў на сябе мецэнат.

*Давыд Гарадзенскі (каля 1283—1326) — кашталян гарадзенскі, военачальнік і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Ён праславіўся як мужны абаронца Гродна. Па адной з легенд, ён пахаваны каля сцен Каложскай царквы.*



Фота БелТА.

# Сустрэча світання не забараняецца

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Затым усіх чакае канцэрт. «Нас прасілі не агучваць загадзя імёны, каб захаваць інтрыгу, але Ягора Крыда дакладна не будзе, — адказала на пытанне журналістаў Ларыса Емяльянчык. — Адважуся сказаць, што гэта будуць самыя папулярныя сярод моладзі на сёння артысты беларускай эстрады». Мяркуецца, што мерапрыемства завершыцца ў 21.00. Затым усіх адзінаццацікласнікаў чакае дзень адпачынку, а ўжо 1 чэрвеня ў навучальных установах стартуюць выпускныя іспыты.

Навучэнцы 11-х класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (на выбар) і матэматыцы пройдуць 1, 4 і 6 чэрвеня. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама іх размесцяць на партале Міністэрства адукацыі. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па розных заданнях і тэкстах. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

**У Мінску выпускныя пройдуць 9 чэрвеня. Мяркуецца, што ўрачыстасці распачнуцца ў 20 гадзін і працягнуцца да 4-6 гадзін раніцы.**

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 5 і 7 чэрвеня.

Пры складанні экзаменацыйнага раскладу павінны ўлічвацца санітарныя нормы і правілы. Перапынак паміж экзаменамі — не менш за адзін дзень. Для выпускнікоў базавай школы на выкананне пісьмовай работы па беларускай і рускай мове адводзіцца 1 астранамічная гадзіна і 4 астранамічныя гадзіны — для напісання матэматыкі. Адзінаццацікласнікі пішуць пераказ па мове 4 астранамічныя гадзіны, а на матэматыку даецца на гадзіну больш. Для падрыхтоўкі да вуснага адказу выпускнікам адводзіцца не больш за 30 хвілін.

Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў пройдуць 9 і 10 чэрвеня. Рашэнне аб даце і месцы іх правядзення, працягласці па часе прымаюць кіраўнікі ўстаноў адукацыі сумесна з бацькоўскімі камітэтамі і ўзгадняюць з мясцовымі органамі ўлады. Толькі ў асобных выпадках выпускныя можа прайсці ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ці ўстанове культуры. Такая сітуацыя магчымая, калі, напрыклад, у школе старой пабудовы няма актавай залы або колькасць выпускнікоў перавышае колькасць месцаў у ёй. У сталіцы 17 устаноў адукацыі ўзгадняць у якасці базы правядзення выпускнога іншыя аб'екты ў горадзе. У Мінску выпускныя пройдуць 9 чэрвеня. Мяркуецца, што ўрачыстасці распачнуцца ў 20 гадзін і працягнуцца да 4-6 гадзін раніцы.

**У 2017/2018 навучальным годзе ў Беларусі функцыянуе 3067 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучаюцца 994,5 тысячы навучэнцаў. У 9-х класах вучацца 85 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак, а ў 11-х класах — 58 тысяч чалавек.**

«Сустрэча выпускнікамі світання дапускаецца пры ўмове, што адказнасць за дзяцей нясуць як педагагічныя работнікі, так і бацькі, — папярэдзіла Ларыса Емяльянчык. — І калі бацькі забіраюць сваё дзіця з выпускнога раней, то яны павінны папярэдзіць класнага кіраўніка і адміністрацыю ўстановы адукацыі. Мы строга парадак не рэгламентуем, але пажадана ўсё зрабіць у пісьмовай форме, таму што ў гэтым выпадку яны бяруць адказнасць на сябе».

Ужо не першы год у дні правядзення апошніх званкоў і выпускных вечароў у краіне дзейнічае забарона на продаж алкаголю ў гандлёвых аб'ектах. І гэта мера, як лічыць **старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення прафілактыкі ГУАПП МУС Аркадзь ХАРЫТОНЕНКАЎ,** прыносіць свой плён. У апошнія гады выпадкаў ужывання спіртных напіткаў на школьных святах заўважана не было. «Калі параўнаць з маім досведам 15—20-гадовай даўнасці, калі я працаваў інспектарам па справах непаўналетніх, то хачу заўважыць, што культура ўзрасла: калі раней многія спрабавалі праносіць з сабой алкаголь, а на свята імкнуліся трапіць пабочныя людзі, то цяпер выпускныя праходзяць спакойна», — падкрэсліў Аркадзь Харытоненкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Дыялог з уладай

**Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць аператыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся каля двух гадоў таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.**

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 26 мая ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах з 9.00 да 12.00, у гэтую суботу іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ПРЫЗАВЫЯ — ЗА ПАСАДУ

### У Мінску распачата крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара цэнтра па Параалімпійскіх і Дэфлімпійскіх відах спорту

**Пра гэта паведамляе Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь. Крымінальная справа ўзбуджаная па матэрыялах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама.**

Следствам устаноўлена, што галоўны трэнер нацыянальнай каманды па інваспорце цэнтра перадала ў якасці хабару 15 тыс. долараў дырэктару ўстановы пры пасярэдніцтве сястры-блізняці кіраўніка за спрыяльнае вырашэнне пытання аб заключэнні новага працоўнага кантракта. Гэтыя грошы раней былі пералічаны галоўнаму трэнеру каманды ў якасці ўзнагароджання за падрыхтоўку спартсменаў, якія занялі прызавыя месцы на Параалімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. Пры гэтым дырэктар дала зразумець, што толькі ў выпадку перадачы ёй гэтых грошай 37-гадовая жанчына зможа працягнуць працу на пасадзе галоўнага трэнера.

46-гадовы дырэктар затрыманая, следчыя будуць хадайнічаць перад пракурорам аб прымяненні да яе меры стрымання ў выглядзе заключэння пад варту. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца, устанаўліваюцца акалічнасці супрацьпраўных дзеянняў.

Спецыялісты Следчага камітэта адзначаюць, што асоба, якая дала хабар, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў адносінах да яе мела месца вымагальніцтва хабару альбо калі гэта асоба пасля дачы хабару добраахвотна заявіла аб зробленым.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ІРАН ПАСТАВІЎ ПЕРАД ЕЎРОПАЙ СЕМ УМОЎ ДЛЯ ЗАХАВАННЯ ЯДЗЕРНАЙ ЗДЗЕЛКІ



Іран прад'явіў еўрапейскім краінам сем умоў, выкананне якіх захавае прыхільнасць Тэгерана ядзернай здзелцы. Пра гэта паведамляе тэлеканал Al Jazeera ў сваім «Твітэры» са спасылкай на духоўнага лідара Ісламскай Рэспублікі аяталу Алі Хаменеі. У прыватнасці, Тэгеран настойвае на тым, што Еўропа павінна забяспечыць гарантыі для продажу іранскай нафты, а таксама адсутнасць перашкод для супрацоўніцтва еўрапейскіх банкаў з Іранам. У адваротным выпадку Іран пакідае за сабой права аднавіць сваю ядзерную актыўнасць, заявіў Хаменеі. Як вядома, Тэгеран і шэсць краін-пасярэднікаў (Расія, ЗША, Вялікабрытанія, Кітай, Францыя, Германія) вызначылі ўмовы іранскай ядзернай праграмы летам 2015 года. Па дагаворы Іран адмаўляецца ад далейшага развіцця гэтай праграмы ў абмен на зняцце санкцый.

### МЭЙ ПРАПАНУЕ ЕЎРАСАЮЗУ ДАМОВІЦЦА АБ ДРУГІМ ПЕРАХОДНЫМ ПЕРЫЯДЗЕ ПАСЛЯ БРЭКСІТУ

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй плануе прапанаваць Еўрасаюзу ўзгадніць другі пераходны перыяд пасля выхаду краіны з ЕС. Пра гэта паведаміла газета The Times. Паводле яе даных, мяркуецца, што пераходны перыяд будзе доўжыцца да 2023 года. Падчас яго будуць вырашацца мытныя і гандлёвыя пытанні. Чакаецца, што брэксіт пройдзе 29 сакавіка 2019 года, пасля чаго, згодна з планам, павінен наступіць пераходны перыяд, які будзе доўжыцца да 31 снежня 2020 года. На дадзены момант Мэй не накіравала прапанову ў Брусель з-за адсутнасці кансэнсусу з боку ўдзельнікаў перагавораў ад ЕС і Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі, адзначае выданне. Перагаворы па брэксіце павінны працягнуцца да лістапада 2018 года.

### СТРАТЫ КІТАЙСКАЙ ZTE З-ЗА АМЕРЫКАНСКІХ САНКЦЫЙ СКЛАЛІ БОЛЬШ ЗА 3 МЛРД ДОЛАРАЎ




Кітайская кампанія ZTE ацаніла свае страты ад спынення дзейнасці ў выніку санкцый ЗША як мінімум у 20 млрд юаняў (каля 3,1 млрд долараў), паведамляе «Інтэрфакс». Як вядома, карпарацыя займае пятае месца па аб'ёме выручкі сярод сусветных вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання.

Нагадаем, у красавіку ЗША ўвялі сямігадовую забарону на закупку ZTE прадукцыі амерыканскіх тэхналагічных кампаній. Цяпер карпарацыя разлічвае неўзабаве дасягнуць пагаднення з уладамі ЗША, каб аднавіць нармальныя аперацыі. Раней на гэтым тыдні стала вядома, што Пекін і Вашынгтон у агульных рысах узгаднілі схему аднаўлення дзейнасці ZTE.

### ЯЙКІ ЎКЛЮЧЫЛІ Ў «ДЫЕТУ ЗДАРОЎЯ»

Ужыванне ў ежу хоць бы аднаго яйка ў дзень зніжае рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў. Да такой высновы прыйшлі брытанскія навукоўцы на падставе вынікаў даследавання, праведзенага ў Кітаі, у якім узялі ўдзел каля паўмільёна чалавек. Вынікі даследавання апублікаваныя ў часопісе Heart. Навукоўцы лічаць, што яйкі ў дзённым рацыёне чалавека — залог здароўя. Шэраг спецыялістаў цяпер мяркуюць, што прысутнасць яек у штодзённым рацыёне — частка «дыеты здароўя». І тлумачаць гэта тым, што яйкі — адзін з самых насычаных па складзе карыснымі рэчывамі прадуктаў харчавання. У іх змяшчаецца шмат бялку, вітаміны A, D, B і B12, а таксама лютэін і зеаксанцін, якія спрыяюць умацаванню зроку. «З'ядаць адно або нават два яйкі ў дзень — гэта выдатна. Не трэба іх баяцца», — лічыць доктар Фрэнкі Філіпс з Брытанскай дыеталагічнай асацыяцыі. Ён, праўда, папярэджвае: яйкамі не варта злоўжываць, як і любой іншай ежай. У іх шмат бялку, лішак якога ў арганізме стварае празмерную нагрузку на ныркі.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога міністра ўнутраных спраў БССР, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адзінаццатага і дванаццатага скліканняў ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**